турного диалога с местным сообществом, вовлечение сообщества в непосредственное участие в культурной жизни региона.

1. *Мастеница, Е. Н.* Музей в формировании культурной идентичности / Е. Н. Мастеница // Культура и искусство как универсальный фактор духовно-нравственного совершенствования человека и общества : материалы Всерос. очно-заоч. науч.-практ. конф. (с междунар. участием), Чебоксары, 15 дек. 2011 г. / Чуваш. гос. ун-т культуры и искусств. – Чебоксары, 2012. – С. 195–197.

2. Официальная статистика. Годовые данные. Музеи по областям и г. Минску [Электронный ресурс] // Национальный статистический комитет Республики Беларусь : офиц. сайт. – Режим доступа: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/solialnaya-sfera/kult/. – Дата доступа: 05.04.2021.

3. *Ривьер, Ж.-А.* Эволюционное определение экомузея [Электронный ресурс] / Ж.-А. Ривьер // MUSEUM. – 1985. – № 148. – С. 2–3. – Режим доступа: https://unesdoc.unesco.org/ ark:/48223/pf0000127347_rus. – Дата доступа: 27.04.2019.

4. Учреждение культуры «Мотольский музей народного творчества» [Электронный ресурс] : офиц. сайт. – Режим доступа: http://motol.museum.by/. – Дата доступа: 02.04.2020.

5. *Цилага, Е. М.* О некоторых аспектах организации региональных музеев в Греции / Е. М. Цилага, К. Дермицаки, А. Доксанаки // Музеология – музееведение в начале XXI века: проблемы изучения и преподавания : материалы Междунар. науч. конф., Санкт-Петербург, 14–16 мая 2008 г. / С.-Петерб. гос. ун-т ; отв. ред. А. В. Майоров. – СПб., 2009. – С. 110–120.

## СЯДЗІБНЫ СВЕТ: ШЛЯХІ ЯГО ЗАХАВАННЯ

***М. У. Шуліка,***
*магістр мастацтвазнаўства, старшы выкладчык*
*Белгарадскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў і культуры, Расія*

Сярод шматлікіх культурна-гістарычных помнікаў, якія складаюць культурны фонд, асаблівае месца па праве належыць сядзібе. Сядзіба дзіўным чынам убірае ў сябе не толькі архітэктурныя рысы асаблівага ўнікальнага стылю, але і з’яўляецца складнікам духоўнага, гістарычнага і культурнага свету чалавека. Менавіта з гэтым разуменнем і ўзнікае феномен «свет сядзібы», які характарызуе самабытнасць рускай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сядзібны свет – гэта не проста дом, які стаіць адасоблена, гэта непарыўная повязь прыродных, прасторава-мастацкіх і архітэктурна-планіровачных матываў. Гэта той своеасаблівы цэнтр, які займаўся фарміраваннем, развіццём і захаваннем дамінантных рыс культуры.

Нараджэнне рускай загараднай сядзібы назіраецца ў XVIII ст. Нароўні з вотчынай (форма феадальнага зямельнага валодання) з'яўляецца маёнтак. Маёнтак не перадаваўся па спадчыне, валодаць імі маглі буйныя чыноўнікі, пакуль знаходзіліся на службе. Такія маёнткі будавалі недалёка ад буйных гарадоў, каб дваране, не пакідаючы надоўга дзяржаўныя справы, маглі там бываць. Разбоі і пажары знішчалі памешчыцкія дамы, таму праз кожныя два-тры гады будаваліся новыя сядзібы.

Галоўным будаўніком сядзібы лічыўся дваранін. У будаўніцтва ўкладвалі вялікія грошы, бывала так, што даводзілася браць пазыку. Чым багацейшай і прыгажэйшай была сядзіба, тым большы кантраст паўставаў у параўнанні з навакольным сельскім побытам. Звычайна сядзіба ўключала ў сябе панскі дом, дом прыслугі, дом упраўляючага, конны двор, цяпліцы, адрыны, свірны і, вядома, парк і фруктовы сад. У гэты час сядзіба становіцца сапраўдным феноменам Расіі.

Сядзібу XIX ст. можна разглядаць як комплексны архітэктурна-паркавы ансамбль, які ўтваралі панскі дом, два флігелі, стайня, аранжарэя, парк. Неад'емнай часткай любой сядзібы быў сад і наяўнасць у садзе кветніка. Сад мог быць рэшткай парку, часта захоўваў ранейшую паркавую планіроўку. Ужывалася ў садах і імітацыя паркаў, для гэтага ў вузкіх алеях выкарыстоўвалі шчыльную пасадку ліпаў [7].

У сядзібах мяжы XX ст. былі сфармаваныя багатыя бібліятэкі. Кнігі захоўваліся не толькі ў кабінеце гаспадара, іх можна было ўбачыць і ў гасцінай, і ў дзіцячым пакоі, бывала нават, што для бібліятэкі будавалі асобны будынак. Акрамя кніг там захоўваліся архіўныя матэрыялы, бо былі пашана і цікавасць да вывучэння свайго роду, гісторыі маёнтка.

У гэты ж час з'яўляюцца і сядзібы-дачы. Ад звычайных дач яны адрозніваюцца выверанай планіроўкай і адсутнасцю гаспадарчых пабудоў.

Пасля 1917 г. сядзібы перасталі быць прыватнай уласнасцю і страцілі сваю індывідуальнасць. Сачыць за сядзібай у XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было цяжка, пра ранейшую імкнуліся не ўспамінаць, а новая вельмі злівалася з гісторыяй сельскай гаспадаркі краіны. На аснове вялікай колькасці сядзібаў былі арганізаваны калгасы. Некаторым былым уладальнікам сядзіб, якіх пазбавілі права на іх валоданне, дазвалялі працаваць на зямлі і жыць у сядзібным доме. Сядзіба магла стаць месцам выратавання ад арыштаў. Многія багатыя дваранскія сядзібы прыстасоўвалі пад санаторыі і дамы адпачынку для савецкай партыйнай наменклатуры.

У гады Вялікай Айчыннай вайны над былымі сядзібамі зноў пранёсся вогненны смерч. Прыблізна сорак гадоў спатрэбілася для таго, каб аднавіць частку страчаных помнікаў, але ад многіх сядзібаў засталіся толькі руіны.

У 1990-я гг. асабліва востра паўстала пытанне аб захаванні культурнай спадчыны, аднак ніякія захады па яго рэалізацыі не зробленыя. Тыя сядзібы, якім пашчасціла выжыць пасля рэвалюцый і войнаў, пазбавіліся абароны. Яны хутка руйнаваліся пры актыўнай дапамозе мясцовых жыхароў і прыезджых марадзёраў. У руіны ператварыліся каля 70 % будынкаў, якія маглі праіснаваць яшчэ не адно дзесяцігоддзе [5, с. 238]. Стаяць закінутыя будынкі, пабудаваныя ў XIX ст., з грыфам «помнік культуры ахоўваецца дзяржавай». Адна з прычын такога стану – нявызначанасць іх статусу. Спачатку гэта былі помнікі федэральнага значэння, затым яны перайшлі на рэгіянальны ўзровень, пасля іх хацелі перавесці на муніцыпальны баланс, а ў муніцыпалітэтаў, аказваецца, няма сродкаў на ўтрыманне аб'ектаў культурнай спадчыны.

У 2000 г. быў створаны нацыянальны фонд «Адраджэнне рускай сядзібы». Дзякуючы гэтаму фонду з'явіліся два варыянты кантролю над аб'ектамі: перадача на дзяржаўнае ўтрыманне або ў прыватную ўласнасць. Разам з правам уласнасці ўладальнік атрымлівае і абавязацельствы па ахове помніка. Але з боку дзяржавы ўсё адно неабходны кантроль за гэтым аб'ектам.

З 1 студзеня 2006 г. любы жадаючы атрымаў магчымасць набыць ва ўласнасць культурна-гістарычны помнік [1, с. 4]. Пры куплі аб'ектаў інвестары сутыкнуліся з шэрагам праблем. Па-першае, згодна з Федэральным законам № 73 «Аб аб'ектах культурнай спадчыны (помніках гісторыі і культуры) народаў РФ» аб'ект культурнай спадчыны можа выкарыстоўвацца з абавязковым выкананнем наступных патрабаванняў: уласнік



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павінен не толькі ўтрымліваць яго, але і забяспечваць «нязменнасць аблічча і інтэр’ера». Аднаўленне культурна-гістарычнага аблічча сядзібаў шматкроць пераўзыходзіць іх кошт і займае, як правіла, не менш за 10 гадоў: «Пераважная большасць аб’ектаў уяўляе сабой проста руіны» [3]. Па-другое, абавязкі ўліку і кантролю ўсіх аб’ектаў культурнай спадчыны ляжаць на адпаведных дзяржаўных органах па ахове помнікаў культуры.

У студзені 2012 г. у г. Маскве стартавала праграма «Арэнда за рубель». У рамках гэтай праграмы аварыйныя помнікі, сядзібныя комплексы перадаюцца ў прыватныя рукі па льготнай цане – 1 рубель за 1 кв. м у год альбо ў доўгатэрміновую арэнду на 49 гадоў [2]. Помнік архітэктуры перадаецца па рынкавай стаўцы арэнднай платы (чым больш разбурэнняў, тым танней арэнда), але толькі з той умовай, што арандатар за свой кошт праводзіць поўную рэстаўрацыйную працу, па заканчэнні якой ужо ўсталёўваецца памер арэнднай платы ў 1 рубель за 1 кв. м у год. Акрамя дамовы арэнды гэтаксама афармляецца ахоўнае абавязацельства, у якім зафіксаваны ўмовы захавання і выкарыстання помніка і вызначаецца пералік неабходных работ, парадак і тэрміны іх выканання [4].

Такім чынам у 2013–2014 гг. у арэнду перададзена 9 абласных сядзібаў: Пушчына-на-Нары ў Серпухаўскім раёне, сядзіба Аігіна ў Пушкінскім, Зеніна ў Любярэцкім, Чаркізава ў Каломенскім раёнах, дом кіраўніка балашыхінскай мануфактурай у Балашысе, Спаскае ў Васкрасенскім, Васін у Чэхаўскім раёнах, Кузьмінскі ў Дамадзедаве і бальнічны комплекс у сядзібе Грэбнева (Шчолкаўскі раён), а таксама 7 муніцыпальных сядзібаў: сядзіба Кузняцова – конны двор – у Даўгапрудным, Тараскава ў Кашырскім раёне, дом Крумінга ў Любярэцкім раёне, жылы дом XVIII–XIX стст. у Каломне, гаспадарчы корпус XVIII ст. у Каломне, гарадская сядзіба XIX ст. у Каломне, будынак паштовай станцыі XVIII ст. у Солнечнагорскім раёне.

Якасная рэстаўрацыя заўсёды патрабуе вялікіх капіталаўкладанняў. Яна патрабуе вялікай колькасці спецыялістаў – бо праца крапатлівая і магчымая толькі пры ўмове магутнай матывацыі захавання помніка, якая залежыць не толькі ад узроўню ўнутранай культуры і адукаванасці рэстаўратараў, але і ад патэнцыйных карыстальнікаў і інвестараў. На базе сядзібных комплексаў, якія маюць вялікую навукова-пазнавальную і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

архітэктурную каштоўнасць, якія валодаюць унікальнасцю, неабходна арганізаваць цэнтры пэўнай накіраванасці, якія стануць вядучымі нароўні з культурна-асветніцкай дзейнасцю і дзе будуць праводзіцца навуковыя даследаванні.

Такім чынам, агульнарасійская праблема занядбанасці помнікаў архітэктуры з'яўляецца галоўнай і сур'ёзнай праблемай у развіцці краіны і асобных рэгіёнаў. Працэс іх захавання немагчымы без прыцягнення пазабюджэтных сродкаў і дапамогі інвестараў. Яна наглядна паказвае нам, што неабходна прымяніць інавацыйныя падыходы.


1. *Исаченко, Т. С.* Дворянские усадьбы и ландшафт: три века взаимодействия / Т. С. Исаченко // Вестн. С.-Петерб. ун-та. Серия 7. Геология. География. – 2003. – № 4. – С. 88–101.

2. *Каждан, Т. П.* Русская усадьба // Русская художественная культура второй половины XIX в. – М., 1991. – С. 358.

3. *Лихачев, Д. С.* Поэзия садов: к семантике садово-парковых стилей / Д. С. Лихачев. – СПб. : Грифон ; Рос. фонд культуры, 1991. – 471 с.

4. *Стернин, Г. Ю.* Русская загородная усадьба в современных историко-культурных интересах // Русская усадьба. – 1998. – № 4. – С. 249.

5. *Топорина, В. А.* Роль усадебных комплексов в формировании культурных ландшафтов // Проблемы региональной экологии. – 2011. – № 3. – С. 195–203.

6. *Трубинов, Ю. В.* Усадебная культура XVIII–XIX веков / Ю. В. Трубинов. – М. : Наука, 1987. – 49 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МЕЖКУЛЬТУРНЫЙ ДИАЛОГ В КОНТЕКСТЕ ЕВРОПЕЙСКОГО РАЗВИТИЯ


***В. Р. Языкович,***
*кандидат философских наук, доцент,*
*профессор кафедры философии и методологии гуманитарных наук*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*


Проблематика диалога получила развитие в трудах выдающихся специалистов в области гуманитаристики – М. М. Бахтина, Д. С. Лихачева, В. С. Библера [1; 2; 6], крупнейшего немецкого философа М. Бубера [3] и других авторитетных авторов, которые разработали интерпретации феномена диалога в философско-экзистенциальном, культурно-антропологиче-